«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывіста Казакевіча аштрафавалі за стрым з ушанавання памяці Жызнеўскага

20.02.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Зміцер Казакевіч. Фота з Faceboook

Актывіста Змітра Казакевіча аштрафавалі на 30 базавых велічынь (765 рублёў) за вядзенне стрыму з акцыі па ўшанаванні памяці Героя Украіны Міхаіла Жызнеўскага. Пра гэта паведаміў палітык Павел Севярынец на сваёй старонцы ў Facebook.


У судзе Цэнтральнага раёна Мінска палічылі, што відэаздымка – гэта і ёсць удзел у несанкцыянаванай акцыі, і прызналі Казакевіча вінаватым у парушэнні артыкула 23.34 Адміністрацыйнага кодэксу.

Нагадаем, што увечары 22 студзеня ў Мінску ля помніка Тараса Шаўчэнкі “Малады Фронт” правёў акцыю (ускладанне кветак) па ўшанаванні памяці загінулага на Майдане Героя Украіны, беларуса Міхаіла Жызнеўскага. Пасля завяршэння акцыі супрацоўнікі міліцыі затрымалі дваіх яе удзельнікаў – **Вольгу Нікалайчык** і **Дзяніса Урбановіча**. Іх адвезлі ў РУУС Цэнтральнага раёна, адтуль у ізалятар на Акрэсціна, а на наступны дзень адбыўся суд. У выніку суддзя суда Цэнтральнага раёна Шабуня пакарала актывістаў вялікімі штрафамі (50 і 40 базавых велічынь).

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал https://t.me/viasna96

Опубликовать





так


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі


"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?




ГАЛОЎНАЕ

"Станавіся да сцяны — мы цябе сфатаграфуем!" Магшоты палітвязняў



#ВолюВясне





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года (дакумент)

"Разгубленасць і бездапаможнасць". Што распавядаюць былыя палітвязні пра фатаграфаванне ў калоніях (фота)

Метамарфозы суда: дальнабойшчыка абвінавачвалі за падрыў петарды, але асудзілі за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні

Мінімум 12 затрыманых: што вядома пра рэйд КДБ на адвакатаў

Заява аб прызнанні Васіля Палякова палітычным зняволеным

Заява аб прызнанні сямі чалавек палітычнымі зняволенымі

Бацьку траіх дзяцей асудзілі да года калоніі за каментары ў сацсетках


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024



Выбары*2024





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

